

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ

Вясна

Прайшла зіма, замоўклі завірухі,
Уся зямля праснулася ад сна.
Спяшыць да нас госць трэцяй пяцігодкі,
Вясёлы госць—любімая вясна.

Спяшыцца бор надзець сваё ўбранне,
На ім іскрацца кропелькі расы.
І кожны дзень, як музыка над раннем,
Паветра поўняць птушак галасы.

Тут на палях не змоўкне яшчэ гоман
Тых ручайкоў, што шэпчуць на зары,
А па лясу нясецца рэха громам,
Як заспяваюць песні трактары.

Пад гэты спеў, вясёлы і магутны,
Плугі кладуць зямлю за радам рад
І кожны дзень тут раніцай туманнай
Чуваць напеў стаханаўскіх брыгад.

Надыйдзе час і гэты звон і шопат,
Усіх вясёлых песень галасы
На гэтым полі ў ясны дзень асенні
Паўтораць зноў пшаніцы каласы.

А вось цяпер як ласкай свеціць сонца.
Вясна прышла шумлівая ў калгас,
І поўніць сэрца радасцю бясконца,
Што родны Сталін думае аб нас.

Што пад яго цудоўным кіраўніцтвам
Усе заводы, фабрыкі, палі,
Усе народы бацькаўшчыны нашай
Пад гэтым сцягам шчасцем расцвілі.

Саша Янкова

Былая даярка, зараз працуе ў партгабінеце.

Буда-Кашалёўскі раён.

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ. ВЫДАННЕ ЦК КП(б)Б. № 7. КРАСАВІК 1938 г.
На вокладцы: На рацэ Свіслачы. Фото Грына.

ВЫДАТНА ПРАВЕСЦІ СЯЎБУ

Магутная матэрыяльна-тэхнічная база калгаснай вытворчасці, высокі ўраджай 1937 г., багатыя даходы, велізарнейшы ўздым палітычнай і вытворчай актыўнасці мас ствараюць усе ўмовы, каб веснавая сяўба 1938 г. была праведзена ўзорна.

Сельская гаспадарка нашай ордэнаноснай Беларусі таксама мае ўсе магчымасці для дасягнення новых поспехаў, для яшчэ больш грандыёзных перамог умацавання калгаснага ладу.

У мінулым годзе многія калгасы нашай рэспублікі атрымалі высокі ўраджай. У калгасе імя Валадарскага, Магілёўскага раёна, атрыман ураджай жыта 18,3 цэнтнераў з гектара, пшаніцы—18,2 цэнтн., ячменю — 20 цэнтн., ільнавалакна — 7 цэнтн. Калгаснікі калгаса імя Кірава, Мсціслаўскага раёна, дабіліся сярэдняга ўраджаю—жыта 23 цэнтн., пшаніцы і ячменю па 19 цэнтн. з кожнага гектара.

Можна прывесці дзесяткі і сотні іншых прыкладаў, якія пераконваюць у шырокіх магчымасцях атрымаць высокі ўраджай.

Разам з ростам высокай ураджайнасці на калгасных палях расце і вага калгаснага працадня, расце заможнасць і культурнасць калгасных мас. Калгаснікі сельгасарцеляў Мсціслаўскага раёна: „Ротэ Фанэ“, імя Кірава, „Другая пяцігодка“ і іншыя атрымалі на працадзень ад 5 да 10 кілограм зернавых. У калгасе імя Леніна, Гарадоцкага раёна, „Колас“, Смалявіцкага раёна, і інш. калгаснікі атрымалі па 13—14 кілограм на працадзень. Акрамя атрыманых на кожны працадзень зернавых і бульбы калгаснікі калгаса „Іскра“, Шклоўскага раёна, „Кастрычнік“, Чэрыкаўскага раёна, і інш. атрымалі грашыма па 4—5 рублёў.

Натхнёныя поспехамі мінулага года, калгаснікі нашай рэспублікі з яшчэ большай энергіяй уключыліся ў барацьбу за новы ўраджай. Гэта знайшло сваё яркае выражэнне ў соцыялістычных абавязацельствах дзесяткаў тысяч калгаснікаў. Шырыцца барацьба за паспяховае выкананне сталінскага лозунга—даць краіне 7—8мільярдаў пудоў хлеба ў год. Множацца рады стаханаўцаў сельскай гаспадаркі.

К пачатку выхада ў поле соцыялістычным спаборніцтвам ахоплена 7580 калгасаў, звыш 20.000 брыгад і стаханаўскіх звенняў змагаюцца за 20—25—30 цэнтн. зернавых. 245 брыгад у ільнаводчых калгасах узялі на сябе абавязацельствы атрымаць не менш 10 цэнтн. ільнавалакна з кожнага гектара. 1500 старшынь перадавых калгасаў на Ўсебеларускай нарадзе ў сваім звароце заклікалі ўсіх калгаснікаў змагацца ў 1938 г. у сярэднім па рэспубліцы не менш, чым за 13 цэнтн. зернавых, 5 цэнтн. ільнавалакна, 170 цэнтн. бульбы з кожнага гектара пасеўнай плошчы і дабіцца ў сярэднім па калгасам рэспублікі на кожны працадзень калгасніка, як мінімум, 5 кг. хлеба і 2 рублі грашыма.

Усё новыя і новыя калгаснікі з выхадам у поле ўступаюць у спаборніцтва і з першых-жа дзён работы ў полі пачынаюць працаваць па-стаханаўску. Сярод гэтых змагароў за Сталінскі ўраджай значнае месца займаюць жанчыны, якія плячо ў плячо з мужчынамі працуюць на калгасных палях і паказваюць узоры выдатнай работы.

З самага пачатку пасеўнай кампаніі неабходна стварыць усе ўмовы для выкарыстання вялікай колькасці жанчын-калгасніц на палявых работах. Для гэтага трэба зараз-жа ўзяцца за арганізацыю ў калгасах дзіцячых ясляў, пляцовак. Жанчыны-калгасніцы павінны патрабаваць і дапамагчы ў арганізацыі дзіцячых устаноў.

Партыя і ўрад стварылі і ствараюць усе неабходныя ўмовы для далейшага росквіту калгаснай вёскі, для атрымання самых высокіх ураджаяў, для шчаслівага і заможнага жыцця кожнага калгасніка.

Калгаснікі БССР штодзённа адчуваюць гэтыя вялікія клопаты партыі Леніна—Сталіна.

Наша партыя правяла велізарную работу па ачыстцы зямельных органаў ад ворагаў народа, шпіёнаў, дыверсантаў, шкоднікаў, якія насаджаліся фашысцкімі наймітамі шаранговічамі, галадзедамі, бенекамі. Але шкодніцтва да канца яшчэ не ліквідавана. Гэта абавязвае кожны раён, соўгас, калгас, МТС і іх кіраўнікоў большэвіцкай работай хутчэй ліквідаваць вынікі шкодніцтва ў сельскай гаспадарцы і паказаць узоры ў часе веснавой сяўбы і на ўсіх астатніх работах у 1938 г.

У барацьбе за поспехі ў веснавой сяўбе не малую ролю адыгрывае цяглавая сіла--у першую чаргу конь, які шырока выкарыстоўваецца ва ўсіх працэсах сельскагаспадарчых работ. Ворагі народа—трацкісцка-бухарынскія бандыты нанеслі вялікую шкоду калгаснаму коневодству. На працэсе антысовецкага „права-трацкісцкага блока“ фашысцкія шпіёны Чэрноў і Шаранговіч вымушаны былі прызнаць, што яны па прамому заданню нямецкай і польскай разведак знішчалі коней.

У сваім выступленні на Ўсесаюзнай нарадзе кіруючых зямельных работнікаў старшыня СНК СССР тав. Молатаў сказаў: „Пара дабіцца, каб калгасны конь утрымліваўся ў адпаведным парадку, каб барацьба з распаўсюджваемай, так званай „анеміяй“ і з іншымі шкодніцкімі агіднасцямі вялася не на словах, а на справе. Аб гэтым асабліва трэба напомніць таварышам з Беларусі“.

Не мала нашкодзілі ворагі народа і ў севазваротах. Усё гэта рабілася ворагамі, каб выклікаць незадавальненне калгаснікаў, знізіць ураджай, зменшыць кошт працадня. Зараз стаіць неадкладная задача—ліквідаваць вынікі шкодніцтва і на гэтым важнейшым участку.

Пачынаючы з веснавой пахаты, трэба працаваць так, каб забяспечыць сабе перамогу ў спаборніцтве, заваяваць права ўдзелу ва ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, якая адкрыецца 1 жніўня ў Маскве і разгорне перад усім светам гіганцкія перамогі калгаснага ладу. Трэба ўсім стаханаўцам, усім калгаснікам змагацца за права ўдзелу ў выстаўцы. Поспехі веснавой сяўбы таксама будуць залежаць і ад пастаноўкі масава-палітычнай работы. З пачаткам сяўбы масава-палітычная работа павінна быць перанесена на поле, у паляводчыя брыгады, звенні, трактарныя атрады.

Вывучэннем і растлумачэннем рашэнняў партыі і ўраду, „Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР“, азнаямленнем з міжнароднымі падзеямі, перадачай вопыта перадавых людзей калгаснай вёсцы—гэтым зместам павінна быць пранікнута ўся агітацыйна-масавая работа на сяле.

Сяўба ўжо пачалася. Веснавую сяўбу патрэбна правесці так, каб у гэтым годзе атрымаць Сталінскі ўраджай. Шырэй вопыт стаханаўцаў сельскай гаспадаркі—перадавікоў высокіх ураджаяў, змагароў за сталінскія 7—8 мільярдаў пудоў хлеба!

1938 ГОД ЗРОБІМ ГОДАМ

Арганізаваць правільны севазварот

У павышэнні ўраджайнасці вялікае значэнне мае севазварот. Недарма ворагі народа ўсяляк імкнуліся шкодзіць у гэтай галіне, заблытвалі пасеўныя плошчы. Сучаснае кіраўніцтва Наркамзема яшчэ недастаткова змагаецца за ліквідацыю вынікаў шкодніцтва ў галіне ўвядзення севазваротаў.

Кожнаму ясна, што ў тых калгасах, дзе ўведзены севазвароты, дзе правільна расстаўлена рабочая сіла, дзе людзі працуюць па-большэвіцку—там велізарныя поспехі.

Некаторыя прыклады магу прывесці з нашага калгаса, дзе я працую чатыры гады. У нашым калгасе ўведзен даўно севазварот. З арганізацыяй працы таксама справа абстаіць нядрэнна. Калгаснікі працуюць добра, дружна.

У нас растуць новыя кадры стаханаўцаў. Некалькі год таму назад у калгасе лічылася геройствам, калі калгаснікі выконвалі па 0,40 гектара за дзень, а ў мінулым годзе ў нашым калгасе 6 касцоў-стаханаўцаў выкошвалі за дзень па гектару з лішнім кожны. У выніку стаханаўскай работы на працадзень калгаснікі атрымалі па 5,5 кілограма зернавых, 8 кілограмаў бульбы, 7 кілограмаў грубых кармоў для жывёлы.

Некаторыя параўнаўчыя лічбы роста ўраджайнасці і заможнасці калгаснікаў. У 1934 г. ураджайнасць мы мелі па 7,5 цэнтнераў, у 1935 г.—9 цэнтн., а ў 1937 годзе—15 цэнтнераў. У 1938 г. калгаснікі нашага калгаса ўзялі абавязацельства дабіцца ўраджаю не менш 20 цэнтн. зернавых з гектара і на працадзень не менш 10 кг. зернавых і 15 кг. бульбы. І гэты ўраджай мы гарантуем канкрэтнымі справамі: мы яшчэ з восені рассеялі мінеральныя ўгнаенні па зяблеву, зімой вывезлі шмат гною. Вясну мы сустрэлі арганізавана, як след падрыхтаванымі правядзем сяўбу ў самыя кароткія тэрміны. Зернавыя пасеем за 10 дзён, лён і бульбу—за 5 дзён.

У калгасе створаны звенні, якія спаборнічаюць паміж сабой. Мы павінны атрымаць найбольшы ўраджай—гэта яшчэ больш павялічыць магутнасць нашай краіны.

Старшыня калгаса імя Варашылава

Марыя Філіпаўна Купрэева.

Мсціслаўскі раён.

Выведу калгас у перадавыя

Не гледзячы на мой стары ўзрост, я ўсё-ж паставіла перад сабой задачу—дабіцца рэкорднага ўраджаю ільна. З першых дзён я ўзялася за працу. Кожны дзень я наглядала за ўраджаем свайго ільну.

Адзін гектар майго рэкорднага ўчастка ў 1936 г. даў 13,1 цэнтнера высокага нумара.

Работу маю раён ацаніў. Ён прэміраваў мяне хатняй абстаноўкай. Я была абрана дэлегатам на XII Усебеларускі з'езд Советаў, а адтуль непасрэдна дэлегатам на VIII Надзвычайны Усесаюзны з'езд Советаў. Там я ўбачыла блізкага ўсім чалавека, лепшага друга ўсіх працоўных, правадыра сусветнага пролетарыята Сталіна. У мяне яшчэ больш з'явілася ахвоты працаваць.

У 1937 г. звяном, у складзе 14 чалавек, узялі абавязацельства дабіцца з 9 гектараў плошчы не ніжэй 10 цэнтнераў валакна. Гэта я са сваім звяном таксама выканала і атрымала сярэдні ўраджай—10 цэнтнераў 37 кг. з гектара, 19-м нумарам.

У жніўні месяцы 1937 г. агульным сходам калгаснікаў калгаса „Май" мяне абралі старшынёй калгаса. З першых дзён я старанна ўзялася за работу.

Да веснавой пасеўнай кампаніі наш калгас падрыхтаваўся поўнасцю. Насенне ўсё ачышчана, інвентар адрамантаваны. На 1938 г. 34 калгасніка нашага калгаса ўзялі на сябе абавязацельства—сабраць не менш 6 цэнтнераў ільнавалакна. Заключан соцдагавор на атрыманне рэкорднага ўраджаю з калгасам імя Ежова.

Сярод жанчын, якія ўзялі на сябе абавязацельствы—даць рэкордны ўраджай ільна,—Аксіння Ермалаева, Ганна Начанка, Р. Мініна, Анна Мірон.

Арганізаваны ў калгасе звенні, якія між сабой таксама спаборнічаюць на атрыманне высокага ўраджаю. Арганізаваны асобныя жаночыя звенні.

У 1938 г. мы будзем змагацца за самы высокі ўраджай.

Старшыня калгаса

Екацерына Фёдараўна Мініна.

Чэчэрскі раён.

ВЫСОКАГА СТАЛІНСКАГА ЎРАДЖАЮ

ЗА БАГАТЫ ПРАЦАДЗЕНЬ

Шкодніцкая дзейнасць ворагаў народа ў БССР дала сябе моцна адчуваць і ў нашым калгасе. Доўга наш калгас не меў цвёрда замацаванай зямлі. Некалькі разоў зямлю ад нас адразалі і аддавалі суседняму соўгасу, прычым адразалі землі лепшыя, а горшыя пакідалі калгасу. Ніякага севазвароту ў калгасе не было, планы даводзіліся вялікія і прыходзілася сеяць зернавыя па зернавых, канаплю па канаплі. І па жывёлагадоўлі таксама даводзіліся шкодніцкія планы. Усё гэта рабілася, каб выклікаць незадавальненне сярод калгаснікаў.

Дзякуючы штодзённым клопатам таварыша Сталіна аб беларускім народзе, дзякуючы клопатам партыі і совецкага ўрада, якія дапамагаюць нам ліквідаваць вынікі шкодніцтва, нашы калгаснікі становяцца на шлях заможнага жыцця. Ужо ў 1937 г. мы дабіліся ўраджайнасці з гектара 300 цэнтнераў бульбы (наш раён мае бульбяны ўхіл).

На працадзень калгаснікі атрымалі па 1 кг. зернавых і 9 кг. бульбы. Зразумела, што гэта яшчэ вельмі мала, але ў 1938 г. мы даб'емся большага. Мы ўзялі абавязацельства на працадзень атрымаць не менш 5 кг. зернавых і не менш 12 кг. бульбы. Каб дабіцца багатага працадня, мы добра падрыхтаваліся да вясны, бо гэта з'яўляецца залогам у дасягненні мэты. На палі калгаса мы вывезлі 2.600 тон торфу, гною—700 тон. Сабралі курынага памёту 26 цэнтнераў і 7 цэнтнераў попелу. Насенне ў нас хапае і цяглавая сіла падрыхтавана таксама.

У калгасе створана 5 звенняў, трыма кіруюць лепшыя стахановкі-калгасніцы Наста Ферчык, Марыя Сіліжонак, Наста Буферчык. Паміж сабой яны спаборнічаюць, спаборнічаюць паміж сабой і брыгады, а таксама і асобныя калгаснікі.

Пасеўную кампанію 1938 г. правядзем па-большэвіцку, правядзем так, як патрабуе гэтага ад нас партыя і таварыш Сталін.

Еўдакія Лазараўна Лазарэнка
Старшыня калгаса Куйбышэва.

Смалявіцкі раён.

Пры Фаніпольскай МТС створаны курсы трактарыстаў, на якіх навучаецца калгасная моладзь.

На здымку: Інструктар курсаў тав. Гарачка тлумачыць курсантцы тав. Колдруцкай, як патрэбна правільна кіраваць трактарам. (БСФ).

ГАТОВЫ ДА СЯЎБЫ

У мінулым годзе ў калгасе „Усход"я працавала брыгадзірам. Гаспадарчы год мы закончылі з добрымі паказчыкамі. У брыгадзе ільнавалакна сабралі з гектара па 8,2 цэнтнера, ільнанасення—6,7 цэнтнера, а ў сярэднім па калгасу сабралі 5 цэнтнераў. Добры ўраджай мая брыгада атрымала і па астатніх культурах. На працадзень мы атрымалі збожжа па 3 кілограмы і бульбы 6 кілограмаў, не лічачы астатніх культур.

За прыкладную і адданую работу ў брыгадзе мяне абралі старшынёй калгаса. Зараз я разам з калгаснікамі рыхтуюся да веснавой сяўбы. У калгасе арганізаваны стаханаўскія звенні, за імі замацавана цягавая сіла і сельскагаспадарчы інвентар. Паміж звеннямі і брыгадамі разгорнута соцспаборніцтва на лепшую падрыхтоўку і лепшае правядзенне сяўбы, за атрыманне з гектара лёну не менш 6 цэнтнераў, аўса не менш 17 цэнтнераў, бульбы не менш 250 цэнтн., ячменю—не менш 18 цэнтн. Для ўгнаення глебы вывезена 250 тон торфу, 700 тон гною, сабрана 25 цэнтнераў попелу і 15 цэнтнераў курынага памёту.

Увесь сельскагаспадарчы інвентар даўно і добраякасна адрамантаван, насенне поўнасцю ачышчана і апрабіравана.

У поўнай гатоўнасці мы сустракаем вясну першага года трэцяй Сталінскай пяцігодкі. У 1938 г. будзем змагацца за яшчэ большы ўраджай, за выкананне ўказання вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна—даць краіне штогодна 7—8 мільярдаў пудоў хлеба.

Марыя Падгорная
Старшыня калгаса „Усход".

Шклоўскі раён

АГІТАЦЫЙНАЙ РАБОЦЕ— БОЛЬШЭВІЦКІ РАЗМАХ

Радасны, незабыўны час перажывае зараз наша ордэнаносная рэспубліка. На фабрыках, заводах, калгасах, соўгасах, установах і на кватэрах працоўных увесь беларускі народ узмоцнена рыхтуецца да выбараў у Вярхоўны Совет БССР. Як не радавацца такой надзвычайнай падзеі народу, які пры царызме вякамі стагнаў пад ярмом памешчыкаў і фабрыкантаў; народу, аб якім калісьці вялікі рускі паэт Н. А. Некрасаў пісаў:

„Стыдно робеть, закрываться перчаткою,
Ты уж не маленький... Волосом рус,
Видишь, стоит изможден лихорадкою,
Высокорослый больной белорусс:
Губы бескровные, веки упавшие,
Язвы на тощих руках.
Вечно в воде по колено стоявшие
Ноги опухли, колтун в волосах".

Толькі Вялікая Кастрычніцкая рэволюцыя, толькі партыя Леніна—Сталіна вызваліла беларускі народ ад адвечнага рабства, зрабіла яго роўнапраўным, вялікім свабодным народам. Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і асабіста таварыша Сталіна пры брацкай дапамозе вялікага рускага народа з года ў год, з месяца ў месяц расце і мацнее Совецкая Беларусь.

Не гледзячы на прошукі подлых фашысцкіх наймітаў—трацкісцка-бухарынскіх бандытаў, якія многа нашкодзілі народнай гаспадарцы БССР, прамысловасць нашай рэспублікі выпускае ўсё больш і больш прадукцыі. Дастаткова прывесці адну толькі лічбу. У 1937 г. прамысловасць БССР выпусціла прадукцыі ў 21 раз больш выпушчанай прадукцыі ў 1913 г.

У далёкую вечнасць канула гаротнае жыццё беларускай вёскі. Жыццё, пры якім саха і барана былі галоўнымі сродкамі вытворчасці; жыццё, пры якім мякіна замяняла хлеб. Зараз сялянства Совецкай Беларусі жыве весела і заможна. 8672 трактары і 665 камбайнаў працавала на калгасных палях у мінулым годзе. Наша сялянства штодзённа на сабе адчувае вялікія клопаты партыі, урада і асабіста таварыша Сталіна.

Рыхтуючыся да выбараў у Вярхоўны Совет БССР, кожны працоўны нашай рэспублікі аглядаецца на пройдзены шлях свой і сваёй краіны і з хваляваннем думае: ёсць чым ганарыцца, ёсць чаму радавацца! Вось чаму так вяліка актыўнасць народа, вось чаму кожны працоўны гарыць жаданнем сустрэць выбары ў Вярхоўны Совет сваёй рэспублікі з яшчэ большымі дасягненнямі.

Як да вялікага свята рыхтуюцца да выбараў у Вярхоўны Совет роўнапраўныя жанчыны Совецкай Беларусі. Кожная работніца, калгасніца, інтэлігентка, хатняя гаспадыня імкнецца сустрэць выбары з найлепшымі паказчыкамі ў сваёй рабоце. Вялікую зацікаўленасць праяўляюць шырачэйшыя масы жанчын да вывучэння „Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет", да вывучэння Сталінскай Канстытуцыі. З якой актыўнасцю наведваюць яны заняткі! Ад маладых не адстаюць і старыя—яны прагна слухаюць агітатараў.

Партыйныя арганізацыі БССР разгарнулі вялікую работу па падрыхтоўцы да выбараў. К канцу сакавіка па БССР ужо было створана 9170 гурткоў, у якіх 210 тысяч рабочых, работніц, калгаснікаў, калгасніц, служачых, хатніх гаспадынь вывучалі выбарчы закон, Канстытуцыю БССР і знаёміліся з гісторыяй і дасягненнямі Совецкай Беларусі. Партарганізацыі БССР выхавалі дзесяткі тысяч агітатараў. Яны і зараз, як у часе выбараў у Вярхоўны Совет СССР, з большэвіцкім запалам расказваюць аб нашай цудоўнай радзіме, аб яе выдатнай гісторыі і радасным сучасным жыцці.

Быць агітатарам—гэта вялікае майстэрства, і гэтым майстэрствам авалодваюць у нас тысячы і тысячы большэвікоў партыйных і непартыйных.

Сярод агітатараў значную колькасць складаюць жанчыны. Гэта—палкія патрыёткі радзімы, выхаваныя партыяй Леніна—Сталіна. Можна прывесці сотні прыкладаў выдатнай работы жанчын-агітатараў.

Адным з лепшых агітатараў горада Віцебска з'яўляецца комуністка старая работніца фабрыкі імя Кагановіча 65-гадовая тав. Сава. Яна карыстаецца сярод хатніх гаспадынь вялікім аўтарытэтам. Па яе ініцыятыве на ўчастку створаны стралковы гурток, гурткі ГПХА і ГСА.

Выдатныя агітатары выраслі ў нас і сярод хатніх гаспадынь. Яны за час выбараў у Вярхоўны Совет СССР прайшлі вялікую школу грамадскай работы і далучыліся да актыўнага ўдзела ў грамадскім жыцці. У гэтым нумары мы пішам аб рабоце агітатара—хатняй гаспадыні тав. Банвель. Цікава і змястоўна праводзіць яна заняткі.

Тысячы новых агітатараў выраслі ў нас за апошні час. Яны гараць жаданнем апраўдаць давер'е партыі. Але яны адчуваюць патрэбу ў штодзённай дапамозе. Можна прывітаць ініцыятыву Менскага гаркома КП(б)Б, які арганізаваў спецыяльныя курсы актывістак, хатніх гаспадынь. Многія з слухачоў гэтых курсаў вядуць агітацыйную работу. На жаль, далёка не ўсюды агітатары атрымліваюць належную дапамогу. Дрэнна кіруе агітатарамі Барысаўскі РК КП(б)Б. Тут агітатары прадастаўлены самі сябе. Недастатковую работу праводзіць з агітатарамі і Бабруйская і Магілеўская партыйныя арганізацыі. Яны нават не замацавалі на рабоце былых агітатараў.

Неабходна ахапіць усё працоўнае насельніцтва яркай, большэвіцкай агітацыяй. Асабліва важна ахапіць агітацыйнай работай усіх работніц, калгасніц, працоўных аднаасобніц і хатніх гаспадынь. Нельга ні на адну мінуту забываць, што там, дзе аслаблена большэвіцкая агітацыя, там узмацняецца дзейнасць класава-варожых элементаў.

Працоўныя Совецкай Беларусі ў часе выбараў у Вярхоўны Совет СССР аднадушна галасавалі за нерапераможны блок комуністаў і беспартыйных. У надыходзячых выбарах у Вярхоўны Совет БССР беларускі народ яшчэ раз пакажа ўсяму свету, што азначае палітычнае і маральнае адзінства народа. Беларускі народ яшчэ шчыльней згуртуецца вакол партыі Леніна—Сталіна, вакол любімага правадыра і бацькі працоўных усяго света таварыша Сталіна!

Рыхтуемся да выбараў

Працоўныя масы Асіпавіцкага раёна да надыходзячых выбараў у Вярхоўны Совет БССР рыхтуюцца актыўна, па-большэвіцку.

У горадзе на прадпрыемствах, сельсоветах і калгасах ідзе глыбокае вывучэнне „Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР“ і Канстытуцыі БССР. У першых днях сакавіка месяца Райвынканкомам была склікана нарада старшынь сельскіх саветаў. На нарадзе стаяла пытанне аб падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет БССР. Старшыням сельсоветаў былі дадзены канкрэтныя ўказанні і растлумачаны задачы, якія на іх ускладаюцца ў сувязі з падрыхтоўкай да выбараў у Вярхоўны Совет БССР.

У раёне праведзена 7 пленумаў сельсоветаў, 33 сходы калгаснікаў па пытанню аб падрыхтоўцы да выбараў.

Зараз у нас папярэдне намечаны граніцы выбарчых участкаў. На кожны ўчастак вылучаны агітатары. Па раёну працуюць 240 агітатараў. Частка наведвала семінар, а астатнія праінструктаваны аб той велізарнай рабоце, якая на іх ускладзена як на агітатараў. 90 чалавек вучыліся на падрыхтоўчых дзесяцідзённых курсах пры райкоме партыі.

У раёне сістэматычна працуе 109 гурткоў, якімі ахоплена звыш 4376 выбаршчыкаў. Адным з перадавых сельсоветаў да выбараў у Вярхоўны Совет БССР з'яўляецца Градзянскі.

Тут акрамя гурткоў на выбарчых участках, дадаткова арганізавана 6 гурткоў спецыяльна для жанчын—хатніх гаспадынь, да іх прымацаваны лепшыя агітатары.

Прапагандысты, агітатары сваёй работай у гуртках на выбарчых участках не абмяжоўваюцца. Яны таксама бываюць на кватэрах рабочых, калгаснікаў, у брыгадах, звеннях. Узяць, напрыклад, тав. Вераб'ёву—кандыдата партыі. Гэта выдатны прапагандыст калгаса імя Кагановіча, Градзянскага сельсовета. Яна, як загадчык калгаснага клуба і бібліятэкі, праводзіць вялікую агітацыйную работу па выбарах у Вярхоўны Совет БССР.

У гуртку тав. Вераб'ёвай займаецца 43 выбаршчыкі; слухачы, акрамя прапрацоўкі „Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР“, знаёмяцца з пытаннямі бягучай палітыкі. Людзі, якія займаюцца ў гуртку тав. Вераб'ёвай, прачыталі па некалькі дзесяткаў кніг як палітычнай, так і мастацкай літаратуры.

Таксама добрымі прапагандыстамі з'яўляюцца тав. Куроўская з калгаса „Чырвоны сцяг“, Яноўскага сельсовета, Харытановіч з калгаса „III Інтэрнацыянал“, Лапіцкага сельсовета, і шмат іншых.

Улічваючы ўрокі недахопаў у складанні спісаў у час выбараў у Вярхоўны Совет СССР, РВК многа ўвагі ўдзяліў праверцы спісаў выбаршчыкаў з тым, каб на гэты раз не было такіх скажэнняў. Ужо па 13 сельскіх саветах закончылі праверку спісаў выбаршчыкаў.

Падрыхтоўчую работу па выбарах у Вярхоўны Совет рэспублікі мы цесна ўвязваем з пытаннем ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці сярод выбаршчыкаў.

Выбары ў Вярхоўны Совет СССР у нашым раёне прайшлі на высокай ідэйна-палітычнай вышыні. Нашы выбаршчыкі аднадушна галасавалі за блок камуністаў з беспартыйнымі. Мы і зараз прыкладзем усе нашы сілы і намаганні, каб мабілізаваць грамадскасць раёна на выдатную падрыхтоўку да выбараў у Вярхоўны Совет БССР. Задачы перад намі стаяць вялікія, але мы іх з гонарам выканаем.

Леліна—
Старшыня Асіпавіцкага РВК, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР.

Пры Менскім Доме партыйнага актыва арганізаваны гаркомам КП(б)Б кароткатэрміновыя курсы для актыва хатніх гаспадынь, якія праявілі сябе ў часе выбарчай кампаніі. НА ЗДЫМКУ: хатнія гаспадыні слухаюць лекцыю на тэму—„Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР“. Фота С. Грына.

Агітатар

Паліна Афанасьева Банвель—маладая, жыццерадасная жанчына. Гістарычная дата—выбары ў Вярхоўны Совет СССР—зрабіла яе, звычайную хатнюю гаспадыню, папулярным агітатарам Варашылаўскага райкома партыі горада Менска. Гэта знамянальная дата з'яўляецца незабыўнай не толькі ў жыцці Паліны Банвель, але і ўсяго працоўнага чалавецтва. Яна далучыла да актыўнага грамадскага жыцця вялікую колькасць людзей, выхавала сотні тысяч новых актывістаў, прапагандыстаў, агітатараў, арганізатараў. Да ліку гэтых людзей належыць і хатняя гаспадыня Паліна Банвель, зараз выдатны агітатар.

Да выбараў у Вярхоўны Совет СССР, як і ўвесь совецкі народ, рыхтавалася тав. Банвель. Надыйшлі кіпучыя, радасныя дні прадвыбарчай работы. На 10 выбарчым ўчастку былі арганізаваны гурткі па вывучэнню „Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР". У адным з гуркоў займалася і Паліна Банвель. Прапагандыст праявіў усе свае здольнасці ў тым, каб лепш і жывей праводзіць заняткі. Гэта дало магчымасць выклікаць небывалую актыўнасць хатніх гаспадынь да заняткаў.

Спадабаліся Паліне заняткі ў гуртку. На заняткі прыходзіла заўсёды падрыхтаванай, уважліва слухала прапагандыста і выступленні жанчын. Дома многа чытала. У гуртку яна была адна з лепшых актывістак. На ўсе пытанні давала поўныя, вычарпальныя адказы. Жанчыны, удзельніцы гуртка, паважалі Паліну, звярталіся за дапамогай і яна ім дапамагала.

Заўважылі ў парткоме трамвайнага парка здольнасці Паліны Афанасьеўны, што яна можа быць палкім агітатарам. І неўзабаве вылучылі яе агітатарам гуртка хатніх гаспадынь, які яна наведвала. Яшчэ больш энергічна ўзялася Паліна Афанасьева за работу. Жаданне вывесці свой гурток у перадавыя па ўчастку, усебакова падрыхтаваць жанчын не пакідала яе. І гэтага яна дабілася. Яе гурток к дню выбараў прышоў добра падрыхтаваным. Дзень выбараў—12 снежня—яны сустрэлі як самы радасны, самы шчаслівы дзень у сваім жыцці. На выбарчы ўчастак прышлі першымі з музыкай, з песнямі, са сцягамі.

Выбары прайшлі. Паліна Банвель не толькі не пакідае сваёй работы, але сваю работу на выбарчым участку яшчэ з большай энергіяй замацоўвае. Адзін раз у тыдзень у яе на кватэры збіраюцца хатнія гаспадыні на заняткі гуртка. Тут яны разбіраюць пытанні аб падзеях у Іспаніі, Кітаі і пытанні бягучай палітыкі. У гуртку яны вывучалі рашэнні Студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б) „Аб памылках парторганізацый пры выключэнні комуністаў з партыі, аб фармальна-бюракратычных адносінах да апеляцый выключаных з ВКП(б) і аб мерах па ўстараненню гэтых недахопаў". Вывучалі таксама рашэнні апошняга пленума ЦК ВЛКСМ і г. д.

Асабліва жыва ішла работа ў гуртку ў сувязі з працэсам над бандай „права-трацкісцкага блока". Амаль штодзённа збіраліся і чыталі матэрыялы працэса. Спецыяльна былі праведзены ўнечарговыя заняткі гуртка хатніх гаспадынь, на якіх яны чыталі прыгавор Вярхоўнага суда. Прыгаворам яны былі бязмежна рады і ўдзячны нашаму пролетарскаму суду.

— Прыгавор Вярхоўнага суда,—заяўляе тав. Грамаза,—гэта прыгавор усяго совецкага народа, гэта прыгавор наш.

Мы, хатнія гаспадыні,—гаворыць тав. Канстанцінава,—павінны быць таксама пільнымі. Мы абавязуемся выхоўваць сваіх дзяцей у духу нянавісці да здраднікаў, ворагаў народа, якія пасягаюць на наша радаснае жыццё. З малых год мы навучым дзяцей любіць нашу квітнеючую радзіму, роднага бацьку таварыша Сталіна.

Жанчыны выказвалі сваю ўдзячнасць совецкім разведчыкам і іх сталінскаму кіраўніку тав. Ежову. Жанчыны абавязаліся быць непасрэднымі памочнікамі нашых зоркіх вартавых—органаў НКВД ў выкрыцці класавых ворагаў.

Патрэбна адзначыць, што многія з жанчын значна выраслі ў агульным развіцці за час работы гуртка. Многія з іх раней не цікавіліся ні радыё, ні газетамі, рэдка наведвалі сходы. Ведалі толькі свае хатнія гаспадарчыя справы. Зараз кожная чытае не толькі газеты, але і мастацкую літаратуру. Вось, напрыклад, тав. Бельская прачытала „Маці" Максіма Горкага, „Ціхі Дон" Шолахава і інш. Многія сталі актыўнымі наведвальнікамі кінотэатра. Яны ў далейшым рашылі, што будуць праводзіць калектыўны прагляд кінокарцін, будуць абмяркоўваць іх на гуртку.

Зараз перад Палінай, яе гуртком, як і перад усёй Беларускай ССР, стаіць не менш важная і адказная задача. Надыходзяць выбары ў Вярхоўны Совет БССР, да якіх мы павінны прыйсці не менш падрыхтаванымі, як да выбараў у Вярхоўны Совет СССР. Да гэтай работы Паліна ўжо прыступіла. Яны вывучаюць Канстытуцыю БССР, „Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР".

Тав. Банвель—яркі прыклад вялікага палітычнага росту хатніх гаспадынь у нашай краіне.

Старавойтава.

Менск.

Мая грамадская работа

Радасна жыць совецкім жанчынам у Сталінскую эпоху. Быць па-за палітычным жыццём у такой цудоўнай краіне нельга.

Вырасла многа актывістак сярод хатніх гаспадынь, якія лічыліся раней неарганізаваным насельніцтвам.

Я таксама належу да ліку тых хатніх гаспадынь, якія нядаўна пачалі прымаць удзел у грамадскай рабоце. Раней я не цікавілася нічым і займалася толькі хатнімі справамі. Але ў апошнія гады мая бяздзейнасць стала цягаціць мяне. Наша многагранная совецкая сапраўднасць захапіла мяне. Я бачыла, што нельга стаяць у баку. Пачалася мая грамадская работа з дробязей.

Аднойчы мая суседка К. расказала, як многа яна церпіць ад свайго мужа, які літаральна здзекваецца над ёй, б'е, прапівае грошы. Мяне такія адносіны да жанчыны вельмі ўсхвалявалі. Схадзіла на завод сама, расказала і дабілася вынікаў. Яго выклікалі, пагаварылі з ім, заняліся яго выхаваннем і зусім змяніліся адносіны яго да жонкі.

На гэтым маленькім факце я ўбачыла, што кожная з нас, у тым ліку і я, можам быць карыснымі. З гэтага часу я пачала прымаць удзел у грамадскай рабоце жакта, школе, дзе вучыцца мая дачка. Асабліва мне спадабалася работа ў школе. Я зразумела, як многа мы, мацеры, можам дапамагчы школе ў выхаванні нашых дзяцей, што патрэбен цесны кантакт школы і бацькоў.

Што мы робім пры школе? Галоўнае—гэта дапамагаем настаўнікам у барацьбе з непаспяховасцю, дапамагаем падцягваць адстаючых. Для гэтага мы часта ходзім да адстаючых школьнікаў дамоў, гутарым з бацькамі, даем парады, а потым правяраем, як выконваюцца нашы ўказанні бацькамі.

Вельмі часта прыходзіцца наглядаць, што па віне саміх бацькоў, якія не ўдзяляюць увагі сваім дзецям, не займаюцца іх выхаваннем,—дзеці становяцца грубымі, хуліганяць. На асабістым вопыце выхавання сваіх дзяцей я ведаю, якое мае вялікае значэнне сувязь са школай і працяг надаму школьнага выхавання.

Хачу расказаць аб адным факце. У школе № 11 вучань Лабкоўскі, раней спакойны хлапчук, пачаў дрэнна вучыцца, грубіць настаўнікам, дарослым, хуліганіць на вуліцы. Тройка па дапамозе школе пайшла на абследванне дамоў к гэтаму вучню. І ўстанавілі, што выхаваннем гэтага хлапчука бацькі не займаюцца. Маці ў яго няма, мачыха здзеквалася над ім, лаяла, выганяла з дому, а бацька не звяртаў увагі на сына. Мы сталі наведваць гэтага вучня, гутарыць з бацькам, з мачыхай, паставілі гэта пытанне на бацькоўскім сходзе. Праз некаторы час хлопчык зрабіўся непазнаваемы. Ён зноў пачаў добра вучыцца, перастаў грубіць, хуліганіць—і ўсё гэта таму, што ён адчуў клопаты аб сабе. Такіх фактаў можна было-б прывесці многа.

Я таксама павышаю свой культурны ўзровень. Я штодзённа чытаю газеты, мастацкую літаратуру, наведваю палітычны гурток хатніх гаспадынь, які арганізаван партыйнай арганізацыяй. Мяне абралі старастай гуртка. Я з вялікай ахвотай наведваю гэты гурток.

Сям'я і выхаванне дзяцей не перашкаджаюць мне ў маёй грамадскай рабоце. Усе хатнія справы я раблю сама, мыю бялізну, гатую абеды і іншае. Я планую свае штодзённыя хатнія справы і к двум гадзінам я заўсёды ўжо бываю свабоднай і астатнія часы я ўдзяляю грамадскай рабоце.

Хатняя гаспадыня
Грэдзітор

Менск.

НА ЗДЫМКУ: Студэнтка 3-га курса зубаўрачэбнай школы Калінеўская Н. П. у дазоры, вядзе нагляданні ў часе ваенна-тактычных гульняў комсамольцаў, праведзеных Сталінскім райкомам комсамола горада Менска разам з райсоветам Асоавіяхіма. Фота Мазэлева (БСФ).

АБ ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОЦЕ

Задача, якую я ставіла перад сабой, пачынаючы навучальны год,— гэта выканаць вучэбную праграму. Выхаваць у дзецях любоў да нашай цудоўнай радзімы, любоў к таму, хто прывёў працоўных да шчаслівага і радаснага жыцця, да таварышоў **Леніна і Сталіна.**

Выкананне навучальнай праграмы непарыўна звязана з палітыка-выхаваўчай работай школы. Вось гэта з'яўляецца асноўным у маёй рабоце.

У рэзультаце такой работы ўсе дзеці паспяваюць. Дабіцца гэтага не так цяжка. Праўда, для гэтага неабходна штодзённая работа над сабой. Патрэбна быць у курсе ўсіх падзей нашага багатага жыцця. Трэба ведаць усё аб вялікіх людзях краіны—гэта галоўная база, на якой мы павінны будаваць палітыка-выхаваўчую работу. Трэба старанна падбіраць і прадумваць навучальны матэрыял кожнага дня.

Работу з адстаючымі я пачынаю з першага дня заняткаў, знаёмячыся з дзяцьмі. З першых дзён работы я ўвесь час не выпускаю з поля зроку тых, хто засвайвае пройдзены матэрыял слабей, выклікаючы іх часта, тлумачачы лішні раз. Навучаю рэбят дапамагаць адзін другому. Тут вельмі дапамагаюць гутаркі з дзецьмі аб вялікіх людзях нашай краіны, бо дзеці любяць пераймаць ад старэйшых. Патрэбна толькі навесці іх на такі прыклад. Дзеці майго класа, прапрацоўваючы біяграфіі Леніна і Сталіна, узялі на сябе абавязацельствы вучыцца на „выдатна". Гэта дапамагае і ў дысцыпліне.

Мой вучань Віця М., хлопчык вельмі сваволны, гаворыць неабдумана і часта перашкаджае ў рабоце класа. Аднойчы я даведалася, што ён жадае быць лётчыкам. Я яму падрабязна расказала, якім павінен быць лётчык і прывяла некалькі прыкладаў з нашых герояў-лётчыкаў. Пасля гэтай гутаркі мой вучань пачаў весці сябе зусім па-другому, пачаў паспяваць у вучобе. Такі метад работы даў мне вельмі многа ў справе паспяховасці і дысцыпліны класа.

Я зусім не праводжу асобных заняткаў з адстаючымі вучнямі класа. Гэтым я не хачу сказаць, што гэтага непатрэбна рабіць. Але малыя дзеці ніяк не хочуць зразумець, што дадатковыя заняткі ім на карысць. Яны лічаць гэта нават пакараннем. Я праводжу дадатковыя заняткі толькі тады, калі гэта вельмі неабходна.

Да выхаваўчай работы ў школе мы прыцягваем і бацькоў.

Маці выдатніка Рэні Бараўк абследвала жыллёвыя ўмовы Мані М. У яе дома аказаліся вельмі дрэнныя ўмовы. Тав. Бараўк згадзілася, каб дзяўчынка прыходзіла да яе разам з дачкой рыхтаваць урокі. Пасля гэтага Маня стала значна лепш вучыцца.

Добра пастаўленая выхаваўчая работа—гэта аснова ўсёй работы ў школе, гэта гарантыя 100-працэнтнай паспяховасці. Дзе дысцыпліна дрэнная, дзе шмат адстаючых, там упэўненасцю можна сказаць—няма выхаваўчай работы.

Для таго каб паставіць вучэбна-выхаваўчую работу на належную вышыню, неабходна працаваць на сабой самаму настаўніку.

Ён павінен быць палітычна пісьменным, быць у курсе падзей, чытаць газеты, працаваць над метадамі вучэбна-выхаваўчай работы.

Усё гэта здаецца старая ісціна, а на самой справе мы бачым другое.

У сучасны момант праходзіць атэстацыя настаўнікаў. Я з'яўляюся членам адной атэстацыйнай камісіі горада Менска. Месяц праведзенай работы паказвае, што не ўсё ў нас у парадку. Многія і многія з настаўнікаў, асабліва малодшых класаў, палітычна-непісьменныя, не чытаюць газет, малазнаёмыя з метадамі вучэбна-выхаваўчай работы. Палітычная вучоба сярод настаўнікаў школ у многіх выпадках адсутнічае, а часта пастаўлена дрэнна.

Некаторыя настаўнікі самі не ўладаюць дастатковай граматнасцю робяць памылкі пры пісьме і прапушчаюць памылкі ў сшытках рэбят. Напрыклад, настаўніца 3-га класа 37-ай школы тав. Пішчы пры праглядзе сшыткаў прапусціла амаль ва ўсіх работах па 3—6 памылак. Такія, на вялікі жаль, выпадкі не адзіныя.

Наркомасветы павінен будзе зрабіць адпаведныя вывады і заняцца ліквідацыяй тых буйнейшых недахопаў, якія маюцца ў практыцы работы настаўнікаў. Трэба ў самы кароткі час заняцца палірыхтоўкай і перападрыхтоўкай кадраў у часе летніх канікул.

Настаўніца 45 школы
Д. Сіманчык

Менск

У радыёпакоі, Гомельскай дзіцячай тэхнічнай станцыі. На пярэднім плане Гайдукоў Стась—вучань 8 класа 7 чыгуначнай школы—заканчвае ўсехвалевую радыёлу і Ісаеў Вася—вучань 8 класа 7 чыгуначнай школы—за праверкай мантажа зробленага ім 2-лямпавага прыёмніка. (БСФ).

МОЙ ВОПЫТ

Большэвіцкая партыя і совецкі рад стварылі нам, народным наўнікам, усе ўмовы для выдатй работы ў школе, для глыбокай аботы над сабой.

Мне хочацца падзяліцца' некатоым вопытам сваёй работы ў коле.

Вядома, што задачу высокай касці работы рашае перш за ўсё рок. Грунтоўная падрыхтоўка наўніка да ўрока абумоўлівае веды вучняў і дысцыпліну класа. алі ўрок цікавы як па зместу, ак і па метадах, ён захапляе дзяей, і ім не да свавольстваў.

Я многа рыхтуюся да ўрока. ытаю не толькі праграмную літатуру, але сама падбіраю дадатовыя матэрыялы, каб папоўніць вае веды і зрабіць урок жывым цікавым. Вось, напрыклад, па історыі народаў. Я чытаю не толькі адручнік Шастакова, але і кансультуюся ў спецыяльнага выкладчыка а гісторыі, чытаю тую дадатковую ітаратуру, якую ён мне рэкамендуе, адбіраю мастацкую літаратуру, тады іду на ўрок. Тэма: „Эпоха Іятра I", якую мы нядаўна праодзілі ў 4 класе, прайшла ў нас ельмі цікава. Я падабрала малюні, цікавыя эпізоды з яго жыцця, яго эпохі. Усё гэта перадала аходлівай мовай вучням. Яны ельмі зацікавіліся, зразумелі тэму. калі я правярала іх веды—усе дказалі на „выдатна". Так праходзяць заняткі і па іншых прадмеах. Вось, напрыклад, геаграфія. Зараз мы праходзім Чорнаморскае збярэжжа—Каўказ, Крым. Для аго, каб вучні мелі большае ўяўленне аб прыродзе, прыродных бацыях Крыма і Каўказа, я падабрала ў іншых школах 24 карціны, якія ілюстроўвалі апрацоўку і збор ая, збор апельсінаў, лімонаў і г. д. Карціны асабліва ярка паказваюць тое, што вучні праходзяць. У практыцы сваёй работы і заўсёды імкнуся дастаць як мага больш наглядных дапаможнікаў.

Вучняў сваіх класаў я так зацікавіла заняткамі, што яны з вялікай ахвотай рыхтуюцца да ўрокаў. У мяне не бывае такіх выпадкаў, каб вучні не падрыхтавалі хатніх заданняў. Я ў штодзённай рабоце выхоўваю ў вучняў пачуццё самакантроля. Мы так з імі і дамовіліся, што яны павінны кожны раз правяраць сябе, як яны засвоілі тое, што ім трэба падрыхтаваць да наступнага дня. Для гэтага я прывучаю іх перасказваць тое, што яны вучаць.

Цёплыя веснавыя дні стаяць у Менску. Па садах і скверах загучэлі галасы дзяцей. Пачаліся захапляючыя гульні. На здымку—Дзеці гуляюць у гарадскім скверы.
Фото-эцюд С. Грына.

Вялікае значэнне ў працягванні школьнага выхавання дзяцей мае дапамога бацькоў. І мне бацькі вельмі многа дапамагаюць. У нас наладжана самая цесная сувязь з імі. Я часта збіраю сходы бацькоў, інфармую іх аб вучобе дзяцей.

У парадку соцспаборніцтва яны абавязаліся, што іх дзеці будуць вучыцца на „выдатна". Маці вучня Апенгейма узяла абавязацельства, што яе сын, які раней займаўся дрэнна, будзе займацца на „выдатна". Яна выклікала на соцспаборніцтва маці Гоберман, і ў гэтым спаборніцтве трымае першынства. Таксама маці Юшкевіч, Пікус, Альтшулер, Шыфрына, Вегман спаборнічаюць паміж сабой і іх дзеці падцягнуліся і не маюць дрэнных адзнак.

Гэты вопыт работы з бацькамі я пераношу і ў 6 клас, дзе я працую класным кіраўніком.

У сваіх класах я дабілася 100-проц. паспяховасці і дысцыпліны шляхам індывідуальнага, чулага, уважлівага падыхода да кожнага вучня. У мяне няма агульнага падыхода. З самага пачатку вучэбнага года я вывучаю здольнасці кожнага, інтарэсы і потым праводжу работу. Хачу расказаць аб такім прыкладзе індывідуальнага падыходу. З 11-й школы быў выключан за хуліганства, грубасць і нават пакражы вучань А. Я прыняла яго ў свой клас, вывучыла яго характар, слабыя месцы і пачала з ім займацца. Праз некаторы час вучня А. нельга было пазнаць. Ён пачаў займацца на „выдатна", стаў прыкладным, дысцыплінаваным хлапчуком. Зараз мы яго абралі ў 4 класе старастай, ён карыстаецца любоўю ўсіх вучняў.

У барацьбе з паспяховасцю мне вельмі яшчэ дапамагае спалучэнне палітыка-выхаваўчай работы з вучэбнай праграмай. Палітыка-выхаваўчую работу не адрываю ні на мінуту ад сваёй работы з дзецьмі. Я прывіваю любоў да радзімы, да нашай партыі і правадыроў штодзённа, шточасна.

Нам, настаўнікам, даверана самае дарагое—дзеці. Мы павінны з іх выхаваць новых людзей, дастойных Сталінскай эпохі, беззаветна любячых сваю радзіму, і мы абавязаны з гэтай задачай справіцца.

Лагута Вера Андрэеўна
45-я школа.

28 сакавіка споўнілася 70 год з дня нараджэння вялікага рускага пісьменніка АЛЕКСЕЯ МАКСІМАВІЧА ГОРКАГА. Палкі барацьбіт за справу комунізма, любімейшы пісьменнік і друг нашага народа, пісьменнік з сусветнай славай — такім быў наш любімы Горкі.

Прэзрэнныя мярзотнікі, гнусныя здраднікі нашай радзімы, найміты фашысцкай ахранкі забілі гэтага выдатнага, крышталь-нейшага чалавека Сталінскай эпохі. Наш пролетарскі суд выканаў волю народа і знішчыў гэтых мярзотнікаў, забойцаў з антысовецкага „права-трацкісцкага блока".

Жанчына з блакітнымі вачыма

Невядомы расказ М. Горкага.

Алексей Максімавіч Горкі жыў у Самары ў 1895—1896 гадах, працаваў у „Самарскай газеце" і надрукаваў каля 140 фельетонаў і 31 расказ. Частка расказаў увайшла пазней у іншыя выданні і зборы твораў, а 25 расказаў не былі нідзе перавыданы. Адзін з гэтых расказаў—„Жанчына з блакітнымі вачыма"—мы друкуем ніжэй.

I

Памочнік прыватнага прыстава Зосім Кірылавіч Падшыбла, грузны і меланхалічны хахол, сядзеў у сваёй канцылярыі, круціў вусы і злосна вылупляў вочы ў адчыненае акно на двор часці. У канцылярыі было хмурна, душна і ціха, толькі маятнік вялікага насценнага гадзінніка, завішчэўшы, адлічваў манатоннымі ўдарамі мінуты. А на дварэ было так прывабна, ярка... Тры бяросы сярод яго кідалі ад сябе густы цень, і ў ім на кучы сена, нядаўна прывезенага для пажарных коней, свабодна раскінуўшыся, спаў унцер-афіцэр Кухарын, нядаўна змяніўшыся з дзяжурства. Зосім Кірылавіч глядзеў на яго і злаваўся. Падначалены спіць, а вось ён, яго няшчасны начальнік, павінен тырчаць у гэтай дзірцы і дыхаць вільготнымі выпарынамі яе каменных сценак. І прадставіўшы сабе, з якой-бы прыемнасцю ён сам расцягнуўся адпачыць у ценю на пахучым сене, калі-б час і службовае палажэнне дазволілі яму гэта, Зосім Кірылавіч пацягнуўся, пазяхнуў і яшчэ больш раззлаваўся. Ён адчуў нераможнае жаданне разбудзіць Кухарына.

— Эй ты!.. Эй!.. Жывёла! Кухарын!—гучна крыкнуў ён.

Адчыніліся дзверы, і ў канцылярыю хтосьці ўвайшоў. Падшыбла паглядзеў у акно, не паварочваючыся назад і не адчуваючы ні найменшай цікавасці да таго, хто ўвайшоў, стаіць ззаду яго ля дзвярэй і прымушае рыпець палавіцы пад сваім цяжарам. Кухарын не павярнуўся на яго вокліч. Закінуўшы рукі пад галаву і задраўшы бараду ў неба, ён спаў, і Зосіму Кірылавічу здалося, што ён чуе сакавіты храп падначаленага, такі насмешлівы, смачны храп, які ўзбуджае яшчэ больш жадання адпачынку і злосці на немагчымасць заснуць самому.

І Падшыбла захацелася сыйсці ўніз, каб даць добрага штуршка нагой у выпучаны жывот падначаленага, а потым узяць яго за бараду і выцягнуць з ценю на сонцапёк.

— Эй ты... дрыхні там! Чуеш?!

— Ваша-скародзе, — дзяжурны—гэта я,—прагаварылі ззаду яго спакусліва салодкім голасам.

Падшыбла абярнуўся, злосным поглядам змерыў дзяжурнага, вылупляўшага на яго вялікія тупыя вочы і гатовага зараз-жа накіравацца, куды загадаюць.

— Я цябе клікаў?

— Ніяк не!

— Пытаў?—павысіў голас Падшыбла, паварачваючыся на крэсле.

— Ніяк не!

— Так ідзі-ж ты да д'ябла, пакуль я табе ў башку не пусціў чаго-небудзь!

І ён ужо пачаў сударгава шнарыць левай рукой што-небудзь на стале, а правай моцна ўцапіўся ў спінку крэсла, але дзяжурны хутка шмыгнуў у дзверы і знік. Памочніку прыватнага прыстава здалося недастаткова пачцівым гэта знікненне і яму ва што-б там ні стала хацелася сарваць усё мацней ускіпаўшую злосць на гэтую духату, службу, на спячага Кухарына, на блізкасць ярмарачнай гарачай пары і яшчэ на многае непрыемнае і цяжкое, што чамусьці ўспаміналася яму сёння міжвольна, супроць яго жадання.

— Эй! Ідзі сюды...—крыкнуў ён у дзверы.

Дзяжурны увайшоў і выцягнуўся ля дзвярэй з тварам спужаным і чакаючым.

— М-морда!—хмурна адрасаваўся да яго Падшыбла.—Ідзі на двор, разбудзі Кухарына і скажы яму, каб ён, асёл, не смеў дрыхнуць сярод двара.—Агіднасць... Ну... ступай...

— Слухаю!—Там дама да вас...

— Што?!
— Дама...
— Якая?
— Высокая...
— Дурань. Чаго ёй?
— Да вас...
— Запытай, пайшоў...
— Я пытаўся... Не гаворыць... Мне, кажа, самаго іх благародзе...
— А, д'ябал іх! Клікай... Маладая?
— Так точна...
— Ну клікай... Паварочвайся!.. ужо мякчэй загадаў Падшыбла, аправіўся і зашамацеў паперамі на стале, напусціўшы на панурую фізіяномію сурова начальніцкую міну.

Ззаду яго пачулася шамаценне плацця.

— Што вам трэба?—у поўабарота запытаў Падшыбла, крытычным вокам змерыўшы наведвальніцу. Тая моўчкі прывіталася і павольна паплыла да стала, спадылба паглядаючы на паліцэйскага сур'ёзнымі блакітнымі вачыма. Апранута яна была проста і бедна па-мяшчанску, у хустачцы, у шэрай, вельмі панашанай накідцы, канцы якой яна круціла даўгімі смуглявымі пальцамі маленькіх прыгожых рук. Высокая, поўная, з моцна развітым бюстам, з вялікім нахмураным ілбом яна была неяк асабліва не па-жаночы сур'ёзнай і суровай. З выгляду ёй можна было даць гадоў 27. Рухалася так задумліва павольна, быццам думала, ці не варочацца ёй назад.

— Бач д'ябал які... Грэнадзёр,— падумаў Падшыбла ўслед за сваім пытаннем... Кляўзнічаць пачне.

— Можна мне давецца ў вас...— загаварыла яна густым кантральто і спынілася, нерашуча ўставіўшы свае блакітныя вочы ў вусаты твар паліцэйскага чыноўніка.

— Сядайце, калі ласка... Што, уласна, вам патрэбна даведацца?..—афіцыяльным тонам запытаў Падшыбла, працягваючы думаць пра сябе:

— Якая ядраная жанчына! Хэ!

— Наконт кніжак...—дагаварыла жанчына.

— Кватэрных?

— Не, не гэтых...

— А якіх?

— Вось тых, якія... па якіх... жанчыны гуляюць...

Збыталася жанчына і раптам пачырванела.

— Гэта значыць як?.. Якія жанчыны гуляюць?.. — запытаў Зосім Кірылавіч, узнімаючы бровы і гулліва ўсміхаючыся.

— Розныя жанчыны... якія гуляюць, начныя.

— Це-це-це! Прастытуткі?— прыемна ўхмыльнуўся Зосім Кірылавіч.

— Так! вось яны.—І глыбока ўздыхнуўшы, дама таксама ўсміхнулася, нібы ёй зрабілася лягчэй, калі яна пачула гэтае слова.

— Ага! Ну-с?—Н-так?—Дык што-ж?—пачаў пытаць Зосім Кірылавіч, адчуваючы штосьці вельмі цікавае і пікантнае наперадзе...

— Так вось наконт гэтых кніжак я прышла,—прамовіла жанчына і апусцілася на крэсла, уздыхаючы і неяк дзіўна страсянуўшы галавой—нібы яе ўдарылі.

— Ну-с... Завядзеннішка адкрываеце? Так...

— Не, я для сябе...—І жанчына нізка спусціла галаву.

— Ага... А дзе-ж старая кніжка ў вас?...— запытаў Зосім Кірылавіч і, падсунуўшы крэсла бліжэй да наведвальніцы, працягнуў сваю руку да яе таліі і азірнуўся на дзверы.

— Якая?—У мяне не было...— ускінула тая на яго вачыма, але не зрабіла ні аднаго руха, каб ухіліцца ад яго рукі...

— Патаемна прамышлялі, значыцца?

— Незарэгістравана.

— Бывае! Жадаеце быць на ўчоце? Гэта добра... Бяспечней,— робячыся смялейшым у сваіх намерах, ухваліў яе Зосім Кірылавіч.

— Ды я яшчэ ўпершыню...— адказала дама і сарамліва спусціла вочы ўніз...

— Як гэта ўпершыню? Не разумею,—павёў плячыма Падшыбла...

— Толькі яшчэ хачу... Першы раз. На ярмарку прыехала.— Тлумачыла дама ціхім голасам і не падымаючы вачэй.

— Вось яно што!—Зосім Кірылавіч, адняўшы руку ад яе таліі, адсунуў сваё крэсла і некалькі збянтэжана адкінуўся на яго спінку. Памаўчалі...

— Вось яно як... Так... гэта вы... што-ж? Нядобра-ж. Цяжка. Яно вядома, канечна... Але ўсё-ж такі, дзіўна! Я прызнацца, не разумею... як гэта вы рашаецеся. Калі, сапраўды праўда...

Вопытны паліцэйскі, ён бачыў, што сапраўды праўда, яна была вельмі свежай і прыстойнай для жанчыны вядомай прафесіі. У ёй не было тых характэрных адзнак прадажнасці, якія неабходна адлюстроўваюцца на жаночай фізіяноміі і жэстах нават пасля невялікай практыкі.

— Далі-бог праўда!—Раптам даверліва нахілілася яна да яго.— На такую паганую справу іду і буду я хлусіць. Чаго ўжо? Проста трэба весці справу.

Бачыце што—удава я. Аўдавела, муж—лоцман, утапіўся ў красавіку ў лёдаход. Дзеці ў мяне, двое,—сын дзевяці год, ды дачка сямі. Дастаткаў няма. Родных таксама. Сірата я ўзята была. А яго, нябожчыкава, радня далёка. Ды і нелюбімая я імі... Як яны ў дастатку, а я накшалт жабрачкі перад імі.—Кінуцца-то няма куды. Працаваць-бы, вядома. Дык многа грошай трэба мне, не выпрацуеш столькі... У гімназіі сын-то. Вядома-б, хадайнічаць, каб без платы, але куды-ж мне—бабе? А сын-то хлопчык... такі, ведаеце, разумны. Шкада адрываць ад вучэння. Таксама і дачка... і ёй чаго-небудзь трэба даць. А працай такой, калі сумленнай... ці многа яе? Ды і колькі здабудзеш? І чаго працаваць зноў-жа? Кухарка—калі... то, канечна... пяць рублёў у месяц. Няхопіць! Ніяк няхопіць! А на гэтай справе—калі каму шчасце—адразу можна абкарміцца на год. Мінулую ярмарку наша-ж адна жанчына чатырыста з лішкам схапіла!— Цяпер за лясніка выйшла з грашыма-то, і пані сабе. Жыве... А што сорам... канечна, сорамна... Але толькі... і тое вось памяркуйце. Лёс, значыцца... Заўсёды ўжо лёс. Прышла мне вось на розум такая справа—так значыцца і трэба. Указанне гэта мне ад лёсу... І ўдасца яно—добра... не ўдасца, а толькі пакуты ды ганьбу прыму... таксама лёс. Так...

Падшыбла слухаў яе і зразумеў усё да слова, бо ў яе гаварыў увесь твар. Было ў ім спачатку штосьці спалоханае, а потым ён зрабіўся просты, сухі і рашучы.

Зосіму Кірылавічу зрабілася дрэнна і нечага боязна.

— Пападзіся такой ведзьме ў рукі дурань... усю скуру яна з яго злупіць і ўсё мяса да касцей зніме...—фармуляваў ён свой страх і, калі яна скончыла, суха загаварыў:

— Я-с тут нічога не магу. Звярніцеся да паліцэймейстара. Гэта паліцэймейстара справа і

справа ўрачэбнай інспекцыі. А я нічога не магу...

І яму захацелася, каб яна пайшла хутчэй. Яна зараз-жа паднялася з крэсла, нахілілася і павольна пайшла да дзвярэй. Зосім Кірылавіч, шчыльна сціснуўшы вусны і зажмурыўшы вочы, глядзеў ёй услед і яму хацелася плюнуць ёй у спіну...

— Дык да паліцэймейстара мне, гаворыце?—дайшоўшы да дзвярэй, абярнулася яна... Яе блакітныя вочы глядзелі рашуча і спакойна. А ўпоперак ілба лягла суровая, глыбокая складка.

— Так, так!—паспешліва адказаў Падшыбла.

— Бывайце! Дзякуй вам!

І яна пайшла.

Зосім Кірылавіч абапёрся на стол і мінут дзесяць сядзеў, насвістваючы штосьці пра сябе.

— Якая жывёліна, га?—уголас прагаварыў ён, не паднімаючы галаву.—Таксама дзеці. Якія тут дзеці? Х-ха! Такая гадзіна!

І зноў доўга маўчаў.

— Але і жыццё таксама... калі ўсё гэта праўда. Вяроўкі круціць з чалавека, можна сказаць... Н-так... Злосна абыходзіцца.

І яшчэ памаўчаўшы, рэзюміраваў усю работу сваёй думкі цяжкім уздыхам, рашучым пляўком і энергічным усклікам:

— А і пагана-ж!

— Што загадаеце? — вярнуўся ў дзверы дзяжурны чын.

— Га?

— Што загадаеце, ваша скароддзе?..

— Пайшоў во-он!

— Слухаю-с.

— Асёл!—прамармытаў Падшыбла і зірнуў у акно... Кухарын усё спаў яшчэ на сене... відавочна, дзяжурны забыўся разбудзіць яго...

Але Зосім Кірылавіч забыў на сваю злосць, і выгляд свабодна развалiўшагася салдата не абурыў яго ніколькі.

Ён адчуваў сябе спалоханым нечым. Перад ім у паветры сталі блакітныя спакойныя вочы жанчыны і рашуча глядзелі яму прама ў твар. Ён адчуваў цяжар на сэрцы ад іх упартага погляда і некаторую нялоўкасць...

Зірнуўшы на гадзіннік, ён паправіў партупею і пайшоў прэч з канцылярыі, глуха прагаварыўшы:

— Бадай сустрэнемся яшчэ... Напэўна ўжо.

II

І, сапраўды, сустрэліся.

Аднойчы ўвечары, стоячы ў нарадзе каля Галоўнага Дома, Падшыбла заўважыў яе кроках у пяці ад сябе. Яна рухалася ў напрамку да сквера сваёй павольнай, плывучай паходкай, упарта гледзячы кудысьці наперад сябе блакітнымі вачыма, і ва ўсёй яе постаці, высокай і стройнай, у рухах бюста і бёдраў, у сур'ёзным пакорным позірку было штосьці адштурхоўваючае ад яе; занадта пакорлівая фатальная складка на ілбе, яшчэ больш рэзкая цяпер, чым у першую сустрэчу, псавала яе вялікі, поўны рускі твар, робячы яго рэзкім.

Зосім Кірылавіч пакруціў вус, даў прастор некаторай гуллівай думцы, адразу зарадзіўшайся ў яго галаве, і рашыў не выпускаць з-пад увагі гэтую жанчыну.

— Ах, ты, кракадзіл! Пачакай..—у думках паслаў ён ёй услед многаабяцальны ўсклік.

І мінут праз пяць ужо сядзеў з ёй побач на адной з лавак сквера.

— Не пазнаеце? — усміхаючыся, запытаў ён. Яна ўзняла на яго вочы і спакойна змерыла яго імі.

— Не, памятаю. Добры дзень!—ціха прыдушаным голасам сказала яна, але не працягнула яму рукі.

— Ну што, як? Дасталі сабе кніжку?

— Вось!—і яна пачала шукаць у кішэні плацця, усё з той-жа пакорлівай мінай.

Гэта некалькі збянтэжыла паліцэйскага.

— Ды не, мне не трэба, не паказвайце, я веру. Ды я і не маю права... значыцца. Вы лепш раскажыце, як поспехі?..—запытаў ён, зараз-жа падумаўшы:

„А вельмі мне трэба гэта ведаць! Вось ужо! І чаго... манернічаю. Ну-ка, Зосім, валяй прама". Але не гледзячы на тое, што ён падбадзёрыў сябе гэтай думкай, ён усё-такі не рашаўся пайсці прама. Было ў ёй штосьці такое, што не дапускала стаць адразу блізка да яе ў вядомыя адносіны.

— Поспехі-то? Нічога, дзякуй...—і яна не дагаварыўшы, абарвала гутарку і густа пачырванела.

— Ну вось і добра. І віншую... Цяжка з непрывычкі? Га?

Яна раптам усім корпусам рушылася да яго, твар у яе збляднеў, скрывіўся; рот неяк акругліўся, быццам яна хацела крыкнуць, і раптам зноў адкінулася ад яго, адкінулася і прыняла старую позу...

— Нічога... Прызвычаюся...—роўна і ясна сказала яна і, выняўшы хустку, гучна высмаркалася.

Зосім Кірылавіч адчуў, што ў яго шчыміць у грудзях ад усяго гэтага, ад яе рухаў, ад яе суседства і блакітных спакойных, нярухомых вачэй.

Ён раззлаваўся на сябе за штосьці, устаў і працягнуў ёй руку моўчкі і злосна...

— Бывайце,—ласкава сказала яна.

Ён кіўнуў ёй галавой і хутка пайшоў прэч, злосна лаячы сябе дурням і блазнюком.

— Пачакай, матуля! Я табе задам феферу! Ужо я табе пакажу сябе. Ты ў мяне перастанеш корчыць з сябе недатрогу,—пагражаў ён ёй невядома за што. І ўсё-такі адчуваў, што ні ў чым яна не вінавата перад ім.

А гэта яшчэ больш злавала яго.

III

Тыдні паўтара мінуўшы, Зосім Кірылавіч ішоў ад караван-сарая ў напрамку да Сібірскай прыстані і быў спынен крыкам жанчын, лаянкай і іншым скандальным шумам, які даносіўся на вуліцу з акна нейкага шынка.

— Паліцэйскі! Каравул!—крычаў задыхаючыйся жаночы голас. Чуліся нейкія страшэнныя ляскаючыя ўдары, стукала мэбля і хтосьці захоплена, басам, які пакрываў увесь шум, гудзеў:

— Так яе! Яшчэ раз! Прама ў морду! Э-эх!

Зосім Кірылавіч хутка падняўся наверх па лесвіцы, расштурхаў публіку, што згрудзілася ў дзвярах шыначнага зала, і яго вачам прадставілася такая карціна. Перагнуўшыся корпусам праз стол, яго знаёмая, жанчына з блакітнымі вачыма, ухапіла левай рукой за валасы другую жанчыну, прыцягнула яе да сябе і сваёй правай рукой бязлітасна, частымі ўдарамі біла яе па спалоханаму, ужо спухламу ад удараў твару. Блакітныя вочы цяпер былі жорстка прыжмураны, вусны шчыльна сціснуты, ад вуглоў іх да падбародка леглі рэзкія маршчыны, і твар яго знаёмай—раней так дзіўна-спакойны, цяпер быў бязлітасна-злозверскі,—твар чалавека, гатовага бясконца доўга катаваць сабе падобнага і катаваць з асалодай. Жанчына, якую яна біла,—ужо толькі мычэла, рвалася і недарэчна махала па паветру сваімі рукамі. Зосім Кірылавіч адчуў у грудзях прыліў злоснага пачуцця—дзікага жадання помсціць камусьці і за штосьці,—кінуўся наперад і, схапіўшы ззаду за талію катаваўшую жанчыну, ірвануў яе да сябе... Перавярнуўся стол, загрымела разбітая пасуда, публіка дзіка завыла, зашумела.

Зосім Кірылавіч, у нейкім ап'яненні, бачыў, як у паветры мільгацелі рознастайныя дзікія, чырвоныя твары, трымаў буяніўшую ў сваіх абдымках і злосна шаптаў ёй у вуха:

— Ах ты! Буяніць? Скандаліць... Ах ты!

Збітая жанчына валялася на падлозе ў асколках разбітай пасуды і, істэрычна ўсхліпваючы, плакала...

— Яна, значыцца, вунь тая гаворыць гэтай, ваша благародзе, ах ты, гаворыць, мразь вулічная, паскудніца! А гэта як яе дзербулызне... Тая ў яе шклянку з чаем і запусці, а гэта ўхапіла яе за косы, ды і давай і давай! Ну, і так, я вам скажу, біла, што аж зайздросна! Здаравенная!—тлумачыў ход скандала Зосіму Кірылавічу нейкі шустры чалавек у чуйцы...

— Ага! Вось як!?—рычэў Зосім Кірылавіч, усё мацней сціскаючы жанчыну ў сваіх абдымках і адчуваючы, што яму самому хочацца біцца.

— Рамізнік! Давай, рамізнік!—крычаў хтосьці з чырвонай шыяй з акна на вуліцу, напружваючы шырокую спіну і дзіўна выгінаючы яе.

— Ну, ідзі. На гауптвахту! Марш! Абедзве! Ты! Уставай... А ты дзе быў? Ты да чаго прыстаўлены? Ты да чаго прыстаўлен? Мо-орда! Вязі на гауптвахту жыва! Абедзвюх. Ну!

Бравы паліцэйскі, падштурхваючы то тую, то другую жанчыну ў спіны, вывеў іх з зала.

— Дай-ка мне каньяку і зельтэрскай жыва!—звярнуўся Зосім Кірылавіч да палавога і грузна апусціўся на крэсла ля вакна, адчуваючы сябе стомленым і злосным на ўсіх і на ўсё.

Раніцой яна стаяла перад ім такая-ж рашучая і спакойная, як у першую сустрэчу,—глядзела прама ў вочы яму сваімі блакітнымі вачыма і чакала, калі ён загаворыць з ёй.

А Зосім Кірылавіч кідаў паперы па стале, злосны і невыспаўшыйся і, не гледзячы на гэта, не ведаў з чаго пачаць з ёю. Звычайныя ў гэтых выпадках шаблонныя прычэпкі і лаянкі неяк не зрываліся з языка, хацелася знайсці ў сябе штосьці больш злоснае і моцнае і кінуць ёй у твар.

— З чаго ў вас пачалося? Ну, кажы хутчэй.

— Яна мяне вылаяла...—важка прагаварыла жанчына.

— Вялікая важнасць. Скажыце!—сказаў з іроніяй Падшыбла.

— Яна не смее... не пара ёй.

— Ах, бацюхны! Хто-ж ты такая?

—Я па нястачы... калі што... яна...

— Н-так?! А яна з прыемнасці ці што?

— Яна?

— Н-ну, яна. Так?

— Што-ж яна? У яе дзяцей няма...

— Ты вось што... ты маўчы, гадзіна. Ты мяне не маж па губах тваімі дзецьмі. Ты ідзі, але ведай, калі я цябе яшчэ раз сустрэну—у дваццаць чатыры гадзіны вон! З ярмаркі вон! Зразумела? Н-ну! Я вас ведаю! Я цябе узнагароджу. Скандаліць?! Я табе паскандалю... дрэнь!

І словы, адно другога зняважлівей, паскакалі з яго языка ў твар ёй. Яна збляднела і яе вочы звузіліся таксама, як учора ў шынку.

— Вон!— грымеў Падшыбла, грукаючы кулаком у стол.

— Бог вам суддзя...—суха і пагражаюча прагаварыла яна і хутка выйшла з канцылярыі.

— Я табе пакажу, суддзя!— крычаў Зосім Кірылавіч. Яму падабалася абражаць яе. Яго выводзіў з сябе гэты спакойны твар і прамы позірк блакітных вачэй... Чаго яна прыкідаецца і корчыць з сябе нейкую фуфыру? Дзеці?! Глупства. Нахабнасць. Пры чым тут дзеці?

— Гуляшчая баба прыехала на ярмарку прадаваць сябе і ламаецца чамусьці... Пакутніца... па беднасці... дзеці. Каго яна хоча гэтым падмануць? Няма сілы на адкрыты грэх, яна і прыкрывае яго беднасцю. Ф-фа, скажыце!

IV

А яны ўсё-такі былі—хлопчык беленькі і баязлівы, у старой зацяганай гімназічнай форме, з падвязанымі чорнай хусткай вушамі, і дзяўчынка, у клятчатым, не па росту ватэрпруфе. Яны абодвы размясціліся на дошках ля прыстані Кашына і, уздрыгваючы ад асенняга ветру, вялі між сабой ціхую, дзіцячую гутарку. Іх маці стаяла ззаду іх, прытуліўшыся спіной да складзенага нейкага тавара, і зверху ўніз глядзела на іх блакітнымі, ласкавымі вачыма.

Хлопчык быў падобен на яе: у яго вочы таксама былі блакітныя, ён часта паварачваў сваю галоўку ў шапцы з надарваным казырком назад да маці і, усміхаючыся, штосьці гаварыў ёй. Дзяўчынка была моцна рабая, востраносая, з вялікімі шэрымі вачыма, якія ззялі жвава і разумна. Навокал іх на дошках былі раскладзены нейкія вузялкі і клумкі.

Быў канец верасня; з раніцы ішоў дождж, наберажная была перакрыта жыдкай граззю і дзьмуў вецер, халодны і вільготны.

Па Волзе хадзілі мутныя хвалі і шумна пляскаліся аб бераг. Усюды стаяў шум глухі, цяжкі, моцны. Сноўдаліся розныя людзі, заклапочаныя, кудысьці спяшаліся. І на агульным фоне жыцця бойкай наберажнай вуліцы—група з дваіх дзяцей і іх маці, спакойна чакаючых чагосьці, адразу кідалася ў вочы.

Зосім Кірылавіч Падшыбла даўно заўважыў гэтую групу і хоць трымаўся ў баку ад яе, але пільна назіраў за ёй. Ён бачыў кожны рух кожнага з траіх, і яму было чагосьці сорамна...

З Сібірскай прыстані ішоў Кашынскі параход, які праз поўгадзіны адпраўляўся ўверх па Волзе...

Публіка пачала збівацца на дэбаркадэр.

І жанчына з блакітнымі вачыма нахілілася да дзяцей, выпрасталася ўся, увешаная клумкамі, ву-

зялкамі, і пайшла ўніз па лесніцы, ззаду сваіх дзяцей, якія ішлі, узяўшы адзін другога за рукі і таксама былі нагружаны чымсьці...

Зосім Кірылавіч павінен быў таксама ісці на дэбаркадэр. Яму не хацелася гэтага, але патрэбна было, і праз некаторы час ён стаяў недалёка ад касы.

Яго знаёмая купляла білет; у руках яе быў тоўсты жоўты бумажнік—адтуль глядзела пачка крэдытак.

— Мне-б,—гаварыла яна,—ці бачыце, так патрэбна. Іх вось, дзетак, у другі клас, да Кастрамы нам, а я ў трэцім... Можна ім для абодвух адзін білет? Не? А то ўступіце? Вельмі дзякую! Дай вам бог...

І яна адыйшла задаволеная. Дзеці круціліся каля яе і, хапаючы за плацце, аб нечым прасілі. А яна слухала іх і ўсміхалася...

— Ах, бацюхны, ды куплю-ж, сказала. Хіба шкада мне? Па два? Ну... Пастойце тут.

Потым яна накіравалася на масткі, дзе гандлявалі рознай галянтарэяй і фруктамі.

І праз некаторы час ужо зноў стаяла каля дзяцей, гаворачы ім:

— Вось табе, Вара, мыла. Пахучае! На вось панюхай. А табе,—Пеця,—вось нож... Бачыш ты, памятаю. А вось апельсіны—цэлы дзесятак. Ешце... не адразу толькі...

Параход падышоў да прыстані. Штуршок. Усе замітусіліся. Жанчына з дзецьмі схапіла іх рукамі за плечы і прыціснула да сябе, трывожна паглядзеўшы навокал сябе. Усе былі спакойны, і яна, заспакоіўшыся, засмяялася. Дзеці таксама засмяяліся. Паклалі трап і публіка хлынула на параход.

— Стой! Куды прэш! Асёл!—распараджаўся Зосім Кірылавіч, прапушчаючы каля сябе публіку і зварачаючыся да нейкага плотніка, скрозь увешанага пяшчэрам, пілой, сякерай і іншымі інструментамі...

— Д'ябал! Прапусці даму і дзяцей... Які ты недарэчны, браток мой!—дадаў ён ужо мякчэй, калі дама, яго знаёмая з блакітнымі вачыма, праходзячы міма, усміхнулася і пакланілася яму, ідучы на параход...

Трэці свісток.

— Падбірай насавую!..—пачулася каманда з мосціка. Параход уздрыгнуў і павольна пайшоў...

Зосім Кірылавіч акінуў вачыма публіку на палубе і, знайшоўшы сваю знаёмую, пачціва зняў шапку і пакланіўся ёй.

Яна адказала яму нізкім рускім паклонам і пачала паважна хрысціцца.

І паехала ў Кастраму са сваімі дзецьмі.

А Зосім Кірылавіч, паглядзеўшы ёй услед яшчэ крыху, глыбока ўздыхнуў і пайшоў з дэбаркадэра на свой пост. Быў ён хмурны і падаўлены.

Першамайскія падарункі папанінцам.

Лепшыя стаханаўкі-вышывальшчыцы Віцебскага таварыства „8 сакавіка" к 1 мая рыхтуюць падарункі пакарыцелям Паўночнага Полюса тт. Папаніну, Крэнкелю, Шыршову і Фёдараву. Стаханаўкі вышываюць беларускім арнаментам рубашкі, шоўкавыя паясы і новыя хусткі, якія будуць накіраваны папанінцам.

На здымку злева направа тт. Зенько Е. І., Лукашкіна П. Ф. і Козерчук Ф. Д. за вышыўкай.

Фота Лупейка (БСФ)

І. ШАПОЎ

АЎСТРЫЙСКІ ПЛАЦДАРМ ГЕРМАНСКАГА ФАШЫЗМА

Германскі фашызм даўно выношваў планы захопа Аўстрыі. У процівагу яму з поўдня, з горнага перавала Брэннер на Аўстрыю прагна пазіралі італьянскія фашысты. Усялякі раз, калі Гітлер працягваў руку да багаццяў Аўстрыі, на Брэннерэ з'яўляліся ў баявой гатоўнасці італьянскія войскі.

Але ў апошнія гады італьянскі фашызм завяз у ваенных авантурах. Абісінія аказалася такім цвёрдым „арэхам", які гнілыя зубы італьянскага фашызма не ў стане разгрызці ўжо на працягу трох год. Гераічны іспанскі народ аказвае рашучае супраціўленне італа-германскім захопнікам. Усё гэта прымусіла Італію прыкаваць сваю ўвагу к басейну Міжземнага мора і значна палегчыла Гітлеру акупацыю Аўстрыі.

„Трэцяя імперыя" знішчыла Аўстрыю як самастойную дзяржаву. Сямімільённы аўстрыйскі народ папаў пад ярмо германскага фашызма.

Германскі фашызм не проста імкнуўся да захопа Аўстрыі. Гэта краіна, займаючая тэрыторыю ў 83,8 тысяч кв. кілометраў, уладае значнымі багаццямі. Яна ні ў якім разе не пакрыўджана прыродай. Клімат і пладародная глеба Аўстрыі спрыяюць развіццю сельскай гаспадаркі. Каля 40 проц. усёй тэрыторыі краіны пакрыта прыгожымі лясамі. Нетры Аўстрыі маюць рад карысных выкапняў: каменны вугаль, жалеза, свінец, цынк, медзь і інш.

Рад вельмі аўтарытэтных ваенных спецыялістаў Заходняй Еўропы лічыць, што ў часе вайны армія колькасцю ў адзін мільён салдат будзе выдаткоўваць кожны месяц 300 тысяч тон жалеза і сталі і 4 мільёны тон каменнага вугалю, не лічачы 200 тыс. тон нафтапрадуктаў і інш. Між тым фашысцкая Германія, шалёна рыхтуючыся да вайны, адчувае рэзкі недахоп у ваеннай сыравіне.

Акупаваўшы Аўстрыю, Германія спадзяецца раней за ўсё хоць-бы часткова папоўніць свае нямногаколькасныя запасы ваеннай сыравіны. Акрамя таго Аўстрыя мае досыць магутную прамысловасць, у прыватнасці машынабудаўнічую, з'яўляючаюся асновай ваеннай вытворчасці. У краіне маецца сем буйных аўтамабільных заводаў і многа спецыяльных ваенных прадпрыемстваў. Дастаткова ўказаць на завод Веллерсдорф, які выпрацоўваў у 1918 г. за суткі 40 тысяч снарадаў і 500 тыс. патронаў; завод Штэйер, які вырабляў кожны месяц у 1917 г. па 100 тыс. вінтовак і 2 тыс. кулямётаў, і г. д.

Характарызуючы эканамічныя рэсурсы Аўстрыі, якія апынуліся ў руках фашысцкай Германіі, парыжская газета „Энформасьён" піша: „Глеба Аўстрыі асабліва багата жалезам высокай якасці. Між тым Германія здабыла ў 1937 толькі каля $8^1/_2$ мільёнаў тон жалеза, г. зн. у размеры адной трэці сваёй патрэбы... Штогодняя вытворчая магутнасць аўстрыйскіх металургічных заводаў дасягае прыкладна 600 тыс. тон сталі і можа быць даведзена да 1 мільёна тон сталі. Аўстрыя мае таксама адклады магнезіта... Альпы дастаўляюць ёй велізарныя і яшчэ нескарыстаныя рэсурсы гідраўлічнай энергіі... Аўстрыйскія лясы, пакрываючыя каля 3 мільёнаў гектараў, раўняюцца адной чацвёртай часці германскіх лясоў: яны могуць часткова кампенсаваць недахоп у Германіі дрэва і цэлюлозы".

Аўстрыя з'яўляецца таксама дадатковым людскім рэзэрвам. Падзенне нараджальнасці ў Германіі скажацца асабліва моцна на колькаснасці прызыўных кантынгентаў у бліжэйшыя гады. У гэтым годзе агульная колькаснасць прызываемых у германскую армію салдат складзе толькі 329 тысяч чалавек супроць 600 тысяч чалавек, закліканых у армію ў 1913 г. Як відаць, у Германіі дрэнна абстаіць з людскімі рэсурсамі. А між тым Гітлер імкнецца стварыць многамільённую армію. З гэтага пункту гледжання заслугоўвае ўвагі тая абставіна, што, аўладаўшы Аўстрыяй, нямецкі фашызм можа павялічыць сваю армію ў часе вайны на 500 тысяч чалавек.

Захапіўшы Аўстрыю, Германія набыла выгаднае геаграфічнае палажэнне для далейшага націска на краіны Балканскага паўвострава, на Чэхаславакію і Швейцарыю, а таксама на Італію. Іменна ваеннай акупацыяй Аўстрыі германскі фашызм недвусэнсоўна паказаў усяму свету, што ён імкнецца расчысціць сабе шлях уніз па цячэнню Дуная—у Венгрыю, Румынію і на Балканы. Нафту, у якой Германія так востра адчувае патрэбу, яна разлічвае знайсці ў Румыніі. Лес, жалезную руду і медзь, неабходныя германскім фашыстам для вядзення „вялікай" вайны, яны зноў-такі спадзяюцца атрымаць на Балканах. Венгрыі, якая вырабляе многа зярна, мяса і малочных прадуктаў, адведзена, па планах берлінскага генеральнага штаба, роля харчовай базы Германіі.

Акупаваўшы Аўстрыю, Германія падбіраецца шчыльна да югаслаўскіх баксітаў, так неабходных ёй для выплаўкі алюмінія. Германская прамысловасць на працягу апошніх год выплаўляе штогод да 92—95 тысяч тон алюмінія. Між тым Германія мае так мала неабходных для выплаўкі алюмінія баксітаў, што яна вымушана імпартаваць іх у размеры 94—95 проц. сваёй патрэбы. Акрамя таго, Югаславія ўладае буйнымі запасамі другой стратэгічнай сыравіны—вырабляе многа харчовых прадуктаў, у якіх моцна адчувае патрэбу „Трэцяя імперыя".

Стаўшы гаспадаром Аўстрыі, германскі фашызм збіраецца дыктаваць з Вены сваю волю Будапешту, Бухарэсту, Сафіі, Белграду, Афінам*). Ён жадае стаць гегемонам Паўднёва-Усходняй Еўропы.

Для гэтага ім захоплена Аўстрыя. З гэтай-жа мэтай падрыхтоўваецца напад германскага фашызма на Чэхаславакію. Чэхаславацкая рэспубліка прадстаўляе як-бы перадавую лінію абароны дэмакратыі ад накіраванняў фашысцкага агрэсара.

---

*) Будапешт – Венгрыя
Бухарэст—Румынія
Сафія—Балгарыя
Белград – Югаславія
Афіны—Грэцыя

Германскі фашызм заўсёды імкнуўся да таго, каб падпарадкаваць сабе Чэхаславакію. Апошняе прадстаўляе для фашысцкага агрэсара надзвычай ласы аб'ект. Нетры Чэхаславакіі маюць многа вугалю, жалеза, марганца, вальфрама, радыя, золата, срэбра і г. д.

Фінансавае становішча Германіі з'яўляецца плачэўным. Велізарныя выдаткі на ўзбраенне, растучы пасіў унешняга гандлю, няўхільны рост дзяржаўнага доўга, мізэрны залаты запас—усё гэта надзвычай абвастрыла фінансавае становішча Германіі. Як-жа ў гэтым становішчы фашысцкаму драпежніку не зарыцца на багацці Чэхаславакіі! Яна штомесячна (па даных за верасень 1937 г.) выплаўляе 339 тысяч тон чыгуна і сталі, здабывае 3.185 тысяч тон вугалю. Чэхаславакія здабывае штогод у сярэднім золата на 4 млн. і срэбра на 1 млн. чэшскіх крон (1 крона—каля 18 капеек).

Гітлераўскі друк вядзе з дня ў дзень самую раз'юшаную кампанію супроць Чэхаславакіі. Германскі фашызм засылае ў Чэхаславакію цэлыя полчышчы шпіёнаў, тэрарыстаў, дыверсантаў. Галоўная агентура Гітлера ў Чэхаславакіі „судзета-нямецкая партыя" Генлейна—нястомна падрыхтоўвае выступленне фашысцкай „пятай калоны" ў тылу чэхаславацкай арміі. Гітлер робіць усё, каб узарваць Чэхаславакію знутры. Але побач з гэтым германскі фашызм рыхтуе і прамы ваенны напад на Чэхаславакію.

Улічваючы захопніцкія планы свайго суседа, Чэхаславакія моцна ўмацавала свае граніцы з Германіяй. На ўсіх перавалах Судзецкіх і Багемскіх гор, аддзяляючых Чэхаславакію ад Германіі, чэхаславацкім урадам пабудаваны магутныя жалезабетонныя ўмацаванні. Фашысты прызнаюць, што з гэтага боку аўладаць Чэхаславакіяй далёка не проста. Германскі генштаб стаў шукаць іншыя шляхі ўварвацца ў Чэхаславакію, і, відаць, спыніўся на шляху, які вядзе праз Аўстрыю.

Паўднёвая частка Чэхаславакіі прадстаўляе раўніну. З боку Вены па даліне Дуная шлях у Чэхаславакію адчынен. У гэтым напрамку маюцца пяць чыгуначных магістралей і шматлікія шасейныя дарогі. Тут агрэсар не думае сустрэць доўгачасовых фартыфікацыйных будаўніцтваў, калі толькі яны не будуць пабудаваны Чэхаславакіяй у самым тэрміновым парадку.

Германскі фашызм уяўляе сабе, што хоць Чэхаславакія і невялікая, але яна мае магутныя сродкі абароны.

Прамысловасць Чэхаславакіі—яе моцны бок. 80 проц. усёй валавай прадукцыі Чэхаславакіі прыходзіцца на долю яе прамысловасці. Карыснымі выкапнямі і сельскагаспадчымі прадуктамі Чэхаславакія таксама задаволена поўнасцю.

Чэхаславацкая армія прадстаўляе сур'ёзную ваенную сілу, таму што высокаразвітая прамысловасць краіны ў дастатку аснасціла армію навейшай ваеннай тэхнікай. У мірны час чэхаславацкая армія мае 7 карпусоў, але ў часе вайны яна можа разгарнуцца да складу 5 армій (1,5 млн. чалавек), забяспечаных навейшымі сродкамі барацьбы і моцным ваеннапаветраным флотам.

Умацоўваючыся на сваім аўстрыйскім плацдарму, германскі фашызм як-бы ўзводзіць „асадную лінію" супроць Чэхаславакіі.

Германія, бясспрэчна, разлічвае скарыстаць свой аўстрыйскі плацдарм і для таго, каб найбольш дзейсным чынам рабіць уплыў на вырашэнне сяродземнаморскай праблемы. Недарма ў першы-ж дзень акупацыі Аўстрыі германскія часці замацаваліся ля Брэннерскага прахода. Гэта далёка не было толькі сімвалічным жэстам.

З гэтага часу Італія ўладае агульнымі дзяржаўнымі граніцамі з Германіяй. Мусаліні не мае ніякіх падстаў выказваць па гэтаму поваду асаблівага захаплення. З'яўленне ў Брэннера германскіх салдат як-бы адсякае Італію ад Цэнтральнай Еўропы. Між тым італьянскі фашызм быў не супраць граць першую скрыпку ў гэтай частцы Еўропы. Італія вядзе ажыўлены ўнешні гандаль з Югаславіяй і іншымі краінамі Балканскага паўвострава. Венгрыя на працягу рада год плыве ў фарватэры італьянскага фашызма. Албанія—італьянская вотчына.

У гэтым свеце крыкі „брава", якімі італьянскія фашысты акампаніравалі германскай акупацыі Аўстрыі, гучаць непераканаўча і фальшыва. Па ўсёй мажлівасці, у Рыме стараюцца заглушыць гэтымі крыкамі ўспаміны аб катастрафічным разгрому італьянскіх войск пад Капорэта.

Усё паказвае на тое, што захоп аўстрыйскага плацдарма фашысцкай Германіяй павялічвае трывожнае становішча ў Еўропе, набліжае небяспеку ўсеагульнай еўрапейскай вайны.

(„Правда")

Да ваенных дзеянняў у Іспаніі. На здымку: мацеры, жонкі і дзеці рабочых уцякаюць з гарадоў, занятых фашыстамі. (СФ).

Бібліятэка
Узорная
Беларусь
Аўто-пер

Парады па кулінарыі

Грыбны суп

100 грамаў сушаных грыбоў (белых ці падасінавікаў) (прапорцыя на пяць чалавек).

100 грамаў цыбулі, 100 грамаў морквы, ½ шклянкі пярловай крупы, 50 грамаў сліўачнага масла, 100 грамаў смятаны, 10 шклянак вады, солі па смаку.

Некалькі сушаных грыбоў (белых ці падасінавікаў) вымыць, палажыць у каструлю разам з двума цыбулямі, морквай і 1 шклянкай пярловай крупы. Заліць усё гэта вадой і паставіць варыць на ўмераны агонь да таго часу, пакуль грыбы стануць мяккімі. Тады прыбавіць у суп 50 грамаў сліўачнага масла і падаваць на стол. Разліўшы суп па талерках, забяліць кожную талерку сталовай лыжкай смятаны.

Адварная рыба пад таматам

1 кілограм рыбы (судака, бялугі ці асятрыны) (прапорцыя на 5 чалавек).

100 грамаў цыбулі, 3 лаўровых лісціка, 2 карэнчыка пятрушкі, 1 шклянка тамата-пюрэ, 5 шклянак вады, 1 сталовая лыжка белай мукі, 1 сталовая лыжка рускага масла, солі па смаку.

Кілограм рыбы палажыць у каструлю разам з цыбуляй, лаўровым лістом і пятрушкай, заліць вадой, пасаліць па смаку і варыць на ўмераным агні каля гадзіны. Калі рыба будзе гатова, асцярожна вынуць яе з вады, палажыць на блюда і заліць таматнай падліўкай.

Таматная падліўка робіцца наступным чынам: добра размяшаць сталовую лыжку белай мукі са сталовай лыжкай масла, уліць гэту мешаніну ў шклянку тамата-пюрэ і паставіць у адкрытай місцы на маленькі агонь, размешваючы лыжкай.

Калі падліўка закіпіць, то ў яе ўліць шклянку рыбнага бульёну і трохі падагрэць на агні; астудзіўшы падліўку, заліць ёй рыбу.

Тушоная морква, рэпа ці бручка

Кілограм невялікай морквы вымыць, ачысціць, нарэзаць невялікімі кавалкамі, перасыпаць 3 лыжкамі цукру і даць пастаяць, каб яна пусціла сок. Растапіць у каструлі 100 грамаў салёнага масла, палажыць у яго моркаў з сокам і, бесперапынна мяшаючы, падсмажыць да чырвана. Потым заліць смятанай ці малаком так, каб морква была злёгку пакрыта вадкасцю, шчыльна закрыць і тушыць на любым агні ці ў рускай печы 25—30 мінут.

Такая морква—выдатны гарнір да мясных ці бульбяных катлет, яе можна падаваць у выглядзе самастойнай ежы на снеданне. Каб гэта страва была асабліва карыснай, трэба зліць у шклянку сыры маркоўны сок, а потым перад падачай змяшаць яго, не даючы больш кіпець. Сыры маркоўны сок мае многа вітамінаў і надзвычайна карысны дзецям.

Да тушонай морквы падаць таўчоныя белыя сухары. Можна папярэдне падсмажыць іх у масле.

Такім-жа чынам робяць тушоную рэпу і бручку. Але сок іх менш карысны, яго не трэба зліваць, а можна гатаваць разам з гароднінай у масле.

Сібірскія пельмені

300 грамаў мяса (прапорцыя на пяць чалавек).

200 грамаў вельмі тлустай свініны ці свінога сала, 200 грамаў цыбулі, 2 яечка, 750 грамаў мукі, 2 шклянкі вады, 50 грамаў рускага масла, паўтара стакана мяснога бульёна, у якім вараць пельмені.

Прапусціць у машынку ці дробна парубіць сечкай тлустае мяса, нарэзаць дробнымі кавалкамі 200 грамаў свінога сала, пакрышыць 200 грамаў цыбулі, пасаліць, паперчыць па смаку і размяшаць гэты фарш. Потым густа замясіць цеста на 2 яечках і 2 шклянках вады. Раскатаць цеста выразаючы з яго кавалкі, у якія класці фарш і кідаць у кіпячую ваду. Калі пельмені ўсплывуць наверх, асцярожна вылаўліваць іх лыжкай і складаць у каструлю, у якой растоплена 50 грамаў рускага масла; калі пельмені будуць гатовы, уліць у іх паўтары шклянкі бульёну і падаваць на стол.

Адказны рэдактар Г. В. КАГАН.

Адрас рэдакцыі: Менск, Дом працы, 3-ці паверх, пакой 8. Тэл. 24-070.

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 3339. Тыраж 12.200 экз. Галоўлітбел № 4289.
Здана ў набор 1/IV—38 г. Падпісана да друку 13/IV—38 г. У нумары 2½ арк. 120.140 друк. знакаў.

Цана 20 кап.

1-я фабрыка „Мосбелье" прыступіла да масавай пашыўкі летніх дамскіх касцюмаў па мадэлям „Дома модэлей".

На здымку сарафан-касцюм з набіўнога крэп-дэ-шына і касцюм з шэрсці.

Фота Гакава (СФ).